**24.** Словы, якімі карыстаюцца людзі пэўнай прафесіі ў гутарковай мове, называюцца прафесіяналізмамі. Хто ўжывае ў сваёй мове словы ***стайла***, ***лазбень***?

**А)** рыбакі. **Б)** наезнікі. **В)** пчаляры. **Г)** пажарнікі. **Д)** маляры.

**25.** У якіх сказах з прыведзеных ёсць моўныя недакладнасці?

*1) Для гэтай мясцовасці быў характэрны ліставы лес, бо раслі ў асноўным бярозы, асіны.*

*2) Аляксею вельмі ж хацелася дагледзець фільм да канца.*

*3) Якраз каля бяроз і пабудавалі прыгожы трохпавярховы цагельны дом з вялікімі і светлымі пакоямі, якія хутка напоўніліся вясёлым смехам дзяцей.*

**А)** у сказах няма памылак. **Б)** памылкі дапушчаны ва ўсіх сказах.
**В)** 1, 3, 4. **Г)** 2, 5. **Д)** толькі 5.

**26.** Міхась атрымаў заданне выбраць з прыведзеных слоў толькі даўнія народныя назвы вопраткі: *1) гафт; 2) бурнос; 3) жупан; 4) дратаванка; 5) сурдут; 6) пасталы*. Дапамажыце хлопчыку выбраць правільны варыянт.

**А)** няма патрэбных назваў. **Б)** усе словы. **В)** 1, 2, 4, 6. **Г)** 2, 3, 5. **Д)** 5, 6.

**27.** У якіх сказах з прыведзеных трэба на месцы пропуску паставіць коску?

*1) Добра прыпякала сонца _ ды веяў лагодны вецярок.*

*2) Маці сустрэла хлапчукоў на ганку са словамі: «Ідзіце ў хату _ ды сядайце за стол».*

*3) Холадна _ і сыра.*

*4) Пад вечар падуў халодны вецер _ і ўзнялася завіруха.*

**А)** ва ўсіх сказах. **Б)** 1. **В)** 1, 4. **Г)** 2, 3. **Д)** 4.

**28.** ***Мініяцюра*** – невялікі па сваім аб'ёме празаічны або вершаваны твор, завершаны па форме і думцы. Да мініяцюр належаць:
*1) абразкі; 2) фрашкі; 3) версэты; 4) прыпеўкі; 5) эпіграмы; 6) каламыйкі.*
Выберыце з прапанаваных правільныя варыянты.

**А)** усе варыянты правільныя. **Б)** толькі 1.
**В)** 1, 4, 5. **Г)** 2, 3, 6. **Д)** 3, 4, 6.

**29.** Вядома, што старажытнае вершаскладанне мае вялікую розніцу ў параўнанні з сучаснай паэзіяй. Колькі стоп налічвалася ў антычным вершаскладанні?

**А)** 24. **Б)** 26. **В)** 28. **Г)** 30. **Д)** 32.

**30.** Хто з беларускіх пісьменнікаў XIX стагоддзя падпісваў некаторыя творы псеўданімам К. Пастарнак?

**А)** Уладзіслаў Сыракомля. **Б)** Зоф'я Манькоўская. **В)** Ян Чачот.
**Г)** Юзаф Крашэўскі. **Д)** Павел Шпілеўскі.

Конкурс арганізаваны і праводзіцца Грамадскім аб'яднаннем «Беларуская асацыяцыя «Конкурс» сумесна з Акадэміяй паслядыпломнай адукацыі пад эгідай Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь.

*220013, г. Мінск, вул. Дарашэвіча, 3, РЗШ АПА.*
*тэл. (017) 292 80 31, 292 34 01; e-mail: info@bakonkurs.org http://www.bakonkurs.org/*

ГА «БА «Конкурс». Заказ 13. Тыраж 7500 экз. г. Мінск. 2008 г.

Конкурс па беларускай мове
## "БУСЛІК-2008"

*Чацвер, 21 лютага 2008 года*

- працягласць работы над заданнем 1 гадзіна 15 хвілін;
- карыстацца падручнікамі, канспектамі, справачнай літаратурай забараняецца;
- кожны правільны адказ адзначаецца трыма, чатырма ці пяццю баламі; колькасць балаў, якія атрымлівае ўдзельнік, адказваючы на пытанне правільна, вызначаецца складанасцю пытання; складанасць пытання вызначаецца па колькасці ўдзельнікаў, якія правільна на яго адказалі;
- няправільны адказ адзначаецца чвэрцю балаў, прадугледжаных за дадзенае пытанне, і залічваецца са знакам «мінус», у той час, як не даўшы адказу, удзельнік захоўвае раней набраныя балы;
- на кожнае пытанне маецца толькі адзін правільны адказ;
- самастойная і сумленная работа над заданнем – галоўнае патрабаванне арганізатараў да ўдзельнікаў конкурсу;
- на старце ўдзельнік атрымлівае авансам 30 балаў;
- максімальная колькасць балаў, якую можа атрымаць удзельнік конкурсу, – 150;
- пасля заканчэння конкурсу лісток з заданнем застаецца ўдзельніку.

## Заданне для вучняў 10(11)-11 класаў

**1.** Што сеяла Ульяніца з беларускай народнай песні? *Ох, і сеяла Ульяніца ...*

**А)** авёс. **Б)** буракі. **В)** жыта. **Г)** лянок. **Д)** кветкі.

**2.** Вызначце толькі тыя словы, якія маюць пяць гукаў:
*1) заціша; 2) збожжа; 3) будуе; 4) лясок; 5) галлё; 6) аб'ява.*

**А)** 1, 3. **Б)** 2, 4. **В)** 2, 4, 5. **Г)** 3, 6. **Д)** няма такіх слоў.

**3.** Колькі слоў у сказе?
*Празнейкічасчовензвеслярамікакінуўвостраўіпаплыўунізпарацэ.*

**А)** 9. **Б)** 10. **В)** 12. **Г)** 13. **Д)** 14.

**4.** Значэнне якіх слоў з прыведзеных змяняецца са зменай месца націску?
*1) паўза; 2) кара; 3) цэгла; 4) каса; 5) жыта; 6) каралі.*

**А)** усіх слоў. **Б)** 1, 2, 5. **В)** 1, 3, 5. **Г)** 2, 4, 6. **Д)** 2, 3, 4.

**5.** Якога слова не хапае ў фразеалагізме? ... *кола ў возе*.

**А)** патрэбнае. **Б)** дзесятае. **В)** пятае. **Г)** лішняе. **Д)** шостае.

**6.** Як вядома, у мове трэба адрозніваць спалучэнні *1) не раз* і *2) ні разу, 3) не адзін* і *4) ні адзін*. Выберыце з прапанаваных адпаведныя значэнні спалучэнняў: *5) некалькі; 6) многа разоў; 7) ніхто; 8) ні аднаго*.

**А)** 1) - 5), 2) - 6), 3) - 7), 4) - 8). **Б)** 1) - 7), 2) - 5), 3) - 6), 4) - 8).
**В)** 1) - 6), 2) - 7), 3) - 8), 4) - 5). **Г)** 1) - 6), 2) - 8), 3) - 5), 4) - 7).
**Д)** 1) - 8), 2) - 6), 3) - 5), 4) - 7).

**7.** Каму належаць вершаваныя радкі?

*Каб любіць Беларусь нашу мілую,*
*Трэба ў розных краях пабываць…*

**А)** Алесю Звонаку. **Б)** Пімену Панчанку. **В)** Аркадзю Куляшову.
**Г)** Алесю Ставеру. **Д)** Анатолю Вярцінскаму.

**8.** Выберыце з прыведзеных толькі назоўнікі мужчынскага роду:
*1) БРСМ; 2) моц; 3) ВНУ; 4) насып; 5) шампунь; 6) засень; 7) палын.*
**А)** усе назоўнікі. **Б)** 1, 4, 5, 7. **В)** 2, 3, 6. **Г)** 3, 4, 6. **Д)** 4, 5, 7.

**9.** Колькі цвёрдых зычных гукаў у сучаснай беларускай мове?
**А)** 15. **Б)** 19. **В)** 21. **Г)** 23. **Д)** 32.

**10.** Прататыпамі герояў трылогіі «На ростанях» Якуба Коласа сталі жыхары мястэчка…
**А)** Ракуцёўшчына. **Б)** Пінкавічы. **В)** Вязынка.
**Г)** Мікалаеўшчына. **Д)** Стоўбцы.

**11.** Закончыце народнае выслоўе: *Хто ўлетку цяньку шукае, той узімку ...*
**А)** добра засынае. **Б)** галадае. **В)** на печы грэецца.
**Г)** парыцца. **Д)** лётае.

**12.** Ад якіх дзеясловаў з дапамогай прыстаўкі ***неда-*** можна ўтварыць дзеяслоў са значэннем непаўнаты дзеяння, неадпаведнасці норме?
*1) варыць; 2) чуць; 3) лячыць; 4) чытаць; 5) плаціць.*
**А)** ад усіх прыведзеных дзеясловаў. **Б)** 1, 3. **В)** 1, 4, 5. **Г)** 2, 3, 5. **Д)** 2, 4.

**13.** Вядома, што слова ***батлейка*** мае значэнне *'пашыраны і папулярны ў мінулыя часы на Беларусі лялечны тэатр'*. Другі варыянт назвы старадаўняга тэатра – вяртэп. А як яшчэ называлі гэты тэатр? Выберыце правільныя назвы з прыведзеных:
*1) яселка; 2) батляемка; 3) жлоб; 4) остлейка.*
**А)** усе назвы правільныя. **Б)** 1. **В)** 2. **Г)** 3. **Д)** 4.

**14.** Дадзены сказы:
1*) Новых сяброў набывай, але старых не забывай. (Народная прыказка)*
*2) У гушчары старых бароў, як сляза, што ўпала з неба, блішчала вялікае возера. (Легенда «Нарач»)*
*3) На зямлі павінна ўсё цвісці. (А. Вольскі)*
*4) У самы раз была гэтая цеплыня, бо ў лесе стаяў густы халодны туман, у расе былі лекавыя травы, кусты і дрэвы. (М. Лужанін)*
*5) Напрадвесні і ў пушчы не многа красы: толькі вецер шуміць на ўсе галасы ды сухая трава шамаціць каля ног… (У. Дубоўка)*
*6) У гэты дзень снег не ішоў і не скардзіліся зімовыя птушкі… (К. Чорны)*
У якіх сказах дапушчаны пунктуацыйныя памылкі?
**А)** ва ўсіх сказах. **Б)** няма пунктуацыйных памылак.
**В)** 1, 3, 4. **Г)** 2, 6. **Д)** 5, 6.

**15.** ***Сінанімічнымі словазлучэннямі*** называюцца словазлучэнні, …
*1) розныя па сваёй будове, але блізкія па граматычным значэнні і сінтаксічных адносінах паміж словамі;*
*2) розныя толькі па сваёй будове і сінтаксічных адносінах паміж словамі;*
*3) блізкія па граматычным значэнні;*
*4) розныя паводле сэнсавых адносін паміж словамі.*
Выберыце правільны варыянт.
**А)** няма правільнага варыянта. **Б)** 1. **В)** 2. **Г)** 3. **Д)** 4.

**16.** У якіх словах з прыведзеных замест пропуску трэба напісаць літару ***э***?
*1) інж..нер; 2) канц..лярыя; 3) ш..рсцяны; 4) ш..дэўр;*
*5) лат..рэя; 6) інт..рвал; 7) адр..сат; 8) др..вотня; 9) р..зерв;*
**А)** ва ўсіх словах. **Б)** 1, 2, 4, 5. **В)** 2, 3, 5, 6. **Г)** 3, 7, 8. **Д)** 4, 6, 9.

**17.** Вызначце, у якіх сказах з дадзеных лічэбнікі запісаны правільна:
*1) На экскурсіі вучні бачылі дрэва, якому ўжо гадоў дзвесце.*
*2) Паміж двума маладымі бярозкамі Янка знайшоў некалькі грыбоў.*
*3) У школе налічвалася каля ста трыццаць вучняў.*
*4) У музеі адзначылі паўтары тысячнага наведавальніка.*
**А)** ва ўсіх сказах. **Б)** 1. **В)** 2. **Г)** 3. **Д)** 4.

**18.** У ролі якой часціны мовы ўжыта выдзеленае слова ў народным выразе ***можа*** *на двое варожа*?
**А)** назоўнік. **Б)** прыметнік. **В)** дзеяслоў. **Г)** займеннік. **Д)** прыслоўе.

**19.** Вызначце, у якіх прыкладах дапушчаны памылкі:
*1) сабралі паўтара тоны збожжа;* *2) купілі трое парасят;*
*3) Вера непайшла дадому;* *4) прайшло паўтара месяца.*
**А)** ва ўсіх прыкладах дапушчаны памылкі.
**Б)** усе прыклады запісаны правільна. **В)** 1, 3. **Г)** 2, 4. **Д)** 3, 4.

**20.** Як называўся першы беларускі сатырычна-гумарыстычны часопіс, які быў упершыню выдадзены 31 снежня 1924 года?
**А)** «Маланка». **Б)** «Асва». **В)** «Вожык». **Г)** «Авадзень». **Д)** «Кракадзіл».

**21.** Каму з вядомых беларускіх паэтаў Максім Танк прысвяціў наступныя радкі:
*Я ўслухаўся ў сугучча непаўторнае,* *І хлынулі на вочы ліўні зорныя,*
*Загледзеўся ў мігценне струн тваіх, –* *І гром напоўніў музыкай мой слых.*
**А)** Янку Купалу. **Б)** Якубу Коласу. **В)** Нілу Гілевічу.
**Г)** Анатолю Вярцінскаму. **Д)** Уладзіміру Дубоўку.

**22.** *«Слова пра паход Ігаравы»* – помнік літаратуры Кіеўскай Русі …
**А)** IX стагоддзя. **Б)** X стагоддзя. **В)** XI стагоддзя.
**Г)** XII стагоддзя. **Д)** XIII стагоддзя.

**23.** Ад асновы інфінітыва дзеяслова ўтвараюцца … Выберыце патрэбныя выразы:
*1) формы прошлага часу абвеснага ладу;*
*2) формы цяперашняга часу абвеснага ладу;*
*3) дзеепрыслоўі закончанага трывання;* *4) формы ўмоўнага ладу;*
*5) усе асабовыя формы абвеснага ладу;* *6) дзеепрыметнікі прошлага часу.*
**А)** усе выразы правільныя. **Б)** 1, 3, 4, 6. **В)** 1, 2, 4. **Г)** 2, 5. **Д)** 3, 6.